ДЗЯРЖАЎНАЯ НАВУКОВАЯ ЎСТАНОВА
«ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ
НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ»

Аб'ект аўтарскага права
УДК [930.2:003.074:352.075(091)](426-21)“16”(043.3)

ПАЛТАРЖЫЦКАЯ
Надзея Мікалаеўна

# АКТАВЫЯ КНІГІ МЕНСКАГА МАГІСТРАТА ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XVII СТ. ЯК КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ САМАКІРАВАННЯ ГОРАДА

Аўтарэферат
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук
07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання

Мінск, 2023

Работа выканана ў дзяржаўнай навуковай установе «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»

| | |
|---|---|
| Навуковы кіраўнік | **Доўнар Аляксандр Барысавіч** кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык аддзела гісторыі Беларусі XI–XVIII стагоддзяў і археаграфіі дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» |
| Афіцыйныя апаненты: | **Віцязь Сяргей Пятровіч** доктар гістарычных навук, намеснік дырэктара па навуковай і інавацыйнай рабоце дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры» Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі |
| | **Макараў Максім Дзмітрыевіч** кандыдат гістарычных навук, намеснік дырэктара па навуковай рабоце дзяржаўнай установы «Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі» |
| Апаніруючая арганізацыя | **Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт** |

Абарона адбудзецца «13» чэрвеня 2023 г. у 14.00 на пасяджэнні савета Д 01.40.01 па абароне дысертацый на саісканне вучонай ступені доктара гістарычных навук пры Дзяржаўнай навуковай установе «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» па адрасе: 220072, г. Мінск, вул. Акадэмічная, 1; тэлефон вучонага сакратара (8017) 3788519.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па адрасе: 220072, Мінск, вул. Сурганава, 15.

Аўтарэферат разасланы «    »                    2023 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый                    В.Л. Лакіза

# УВОДЗІНЫ

Увядзенне ў навуковае абарачэнне і навуковая апрацоўка крыніц з’яўляецца адным з прыярытэтных напрамкаў для сучаснай беларускай навукі. Пры вывучэнні пытанняў арганізацыі і развіцця мясцовага самакіравання ключавую ролю адыгрывае аналіз справаводчай дакументацыі гарадоў. На сённяшні дзень інфарматыўнасць, паўната і даставернасць актавых кніг, якія былі створаны ў выніку дзейнасці рэгіянальных улад ВКЛ, у беларускай гістарыяграфіі вывучана недастаткова. Не распрацаваны метады іх крыніцазнаўчага, кадыкалагічнага і дыпламатычнага аналізу. Не пастаўлена нават пытанне аб іх мэтанакіраваным і сістэматычным даследаванні. Між тым, спецыфіка дакументаў, якія змяшчаюцца ў гэтых кнігах, можа пераўзыходзіць па сваёй інфарматыўнасці добра вядомыя ў гістарычнай літаратуры кнігі Метрыкі ВКЛ і дакладна іх пераўзыходзіць у плане асвятлення рэгіянальнай гісторыі: гісторыі паветаў і гарадоў з магдэбургскім правам у розных яе аспектах (гістарычнай геаграфіі, генеалогіі, дзейнасці судовых і адміністрацыйных органаў і г.д.). Усё сказанае цалкам адносіцца да такой разнавіднасці актавых кніг, як магістрацкія кнігі, а таксама серыі кніг магістрата Менска[1] (суч. – г. Мінск).

Вывучэнне актавых кніг Менскага магістрата другой паловы XVII ст. дапамагае выявіць новыя, раней невядомыя звесткі па гісторыі гарадскога самакіравання сталіцы Беларусі. Дакументы, з якіх складаюцца магістрацкія кнігі, асвятляюць падзеі гарадскога жыцця з года ў год на працягу доўгага перыяду і таму дазваляюць правесці грунтоўны аналіз даных, выявіць заканамернасці і характэрныя рысы, уласцівыя функцыянаванню магдэбургскага права ў пэўнай мясцовасці. Улічваючы спецыфіку магістрацкіх кніг, можна таксама адзначыць, што шматлікія пытанні адлюстраваныя ў іх больш поўна. Галоўным чынам гэта звязана з тым, што яны фіксавалі непасрэдна ажыццяўленне прававых працэдур, якія знаходзіліся ў веданні і кампетэнцыі органаў самакіравання. Акрамя гэтага, пры аналізе магістрацкіх кніг асобнага горада ці паселішча можна

[1] У тэксце дысертацыі захавана напісанне назвы «Менск», як гістарычнай назвы горада ў азначаны перыяд. Вядома, што ў XVI–XVII стст. у дакументах на старабеларускай мове шырока выкарыстоўвалася форма «Менск», «Менеск», а ў польскамоўных часцей пачынае ўжывацца транскрыпцыя «Mińsk», якая з’явілася, на думку прафесара А. Абрэмска-Яблоньскай, пад уплывам назвы польскага г. Мінска Мазавецкага (Mińsk Mazowiecki). Аднак цалкам форма «Мінск» замяняе гістарычную назву «Менск» у афіцыйных дакументах толькі ў XVIII ст. У той жа час у народнай гаворцы форма «Менск» ужывалася да пачатку XX ст. Такім чынам, прымяняльна да запісаў актавых кніг другой паловы XVII ст., дзе ўжываюцца абедзве формы напісання ў залежнасці ад мовы дакумента, лічым мэтазгодным у беларускамоўным тэксце дысертацыі захаваць форму напісання «Менск» як афіцыйную назву горада ў гэты перыяд.

зрабіць высновы аб карэкціроўцы на месцы нормаў фундацыйнага прывілея на магдэбургскае права і існаванні адступленняў ад умоў канфірмацыйных прывілеяў, што было ў цэлым характэрна для большасці гарадоў ВКЛ. Такім чынам, тэма дысертацыйнага даследавання мае важнае значэнне для далейшага вывучэння крыніц органаў гарадскога самакіравання ў межах станаўлення айчыннага крыніцазнаўства.

Надзённасць тэмы даследавання таксама звязана са станаўленнем дзяржаўнага механізма незалежнай Рэспублікі Беларусь, часткай якой з'яўляецца сістэма мясцовага самакіравання. Замацаванне прынцыпу мясцовага самакіравання ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у форме прававой гарантыі дыктуюць патрэбу актуалізацыі гістарычнага досведу папярэдніх эпох у гэтай галіне. У адпаведнасці з зацвярджэннем Саветам Міністраў пераліку дзяржаўных праграм на 2021–2025 гг. прадугледжана павышэнне якасці і ўдасканалення тэрытарыяльнай сістэмы дзяржаўнага кіравання. У гэтай сітуацыі становіцца неабходным выкарыстанне набытага гістарычнага вопыту, які датычыцца пытанняў мясцовага самакіравання.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРАЦЫ

### Сувязь працы з навуковымі праграмамі (праектамі), тэмамі

Дысертацыйнае даследаванне выканана ў рамках дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў на 2011–2015 гг. «Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава» (падпраграма № 1 «Гісторыя, духоўная і матэрыяльная культура беларускага народа», заданне 1.1.02 «Фарміраванне і функцыянаванне сацыяльных, палітычных, эканамічных, этнакультурных і канфесійных структур на тэрыторыі Беларусі ў эпоху Сярэднявечча і ранняга Новага часу»); на 2016–2020 гг. «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» (падпраграма № 1 «Гісторыя і культура», заданне 1.1.02 «Сацыяльна-эканамічныя працэсы на тэрыторыі Беларусі ў IX – пачатку XXI стагоддзя: крыніцазнаўства, гістарыяграфія, антрапалогія і іншыя спецыяльныя даследаванні»); на 2021–2025 гг. «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы» (падпраграма № 1 «Гісторыя і культура», заданне 12.1.04 «Спецыяльныя гістарычныя навукі і антрапалогія як фактар забеспячэння гуманітарнай бяспекі беларускай дзяржавы»).

Тэма дысертацыйнага даследавання «Актавыя кнігі Менскага магістрата другой паловы XVII ст. як крыніца па гісторыі інстытута самакіравання Менска» зацверджана на пасяджэнні Вучонага савета

дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» (пратакол № 8 ад 17.12.2009 г.); удакладнена на пасяджэнні Савета Д 01.40.01. па абароне дысертацый на атрыманне вучонай ступені доктара гістарычных навук пры дзяржаўнай навуковай установе «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» ў наступнай фармулёўцы: «Актавыя кнігі Менскага магістрата другой паловы XVII ст. як крыніцы па гісторыі самакіравання горада» (пратакол № 1 ад 3.05.2023 г.).

**Мэта даследавання** – вызначыць крыніцазнаўчую каштоўнасць менскіх магістрацкіх кніг другой паловы XVII ст. у вывучэнні гарадскога самакіравання Менска.

Для дасягнення мэты ставіліся наступныя задачы:

1) Устанавіць паўнату, верагоднасць і даставернасць дадзеных магістрацкіх кніг пры даследаванні гісторыі гарадскога самакіравання Менска.

2) Вызначыць склад дакументаў і запісаў кніг Менскага магістрата другой паловы XVII ст.

3) Выявіць спецыфіку менскіх магістрацкіх кніг у залежнасці ад іх дакументальнага складу.

4) Ацаніць ступень інфарматыўнасці магістрацкіх кніг Менска з пункту гледжання даследавання структуры і дзейнасці органаў гарадскога самакіравання Менска другой паловы XVII ст.

*Аб’ект даследавання* – кнігі Менскага магістрата другой паловы XVII ст.

*Прадмет даследавання* – патэнцыял кніг Менскага магістрата як крыніц па гісторыі гарадскога самакіравання.

**Навуковая навізна**

Упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі здзейснены комплексны навуковы аналіз магістрацкіх кніг Менска другой паловы XVII ст. як крыніц. Прааналізаваны кантэкстуальны асяродак іх існавання, разгледжана гісторыя ўтварэнння і перамяшчэння архіва Менскага магістрата, праведзена кадыкалагічнае апісанне кніг. Вызначаны ступені паўнаты, верагоднасці і даставернасці дадзеных магістрацкіх кніг пры даследаванні гарадскога самакіравання, а таксама дадзена характарыстыка спецыфікі магістрацкіх кніг паводле ўнесеных у іх разнавіднасцей дакументаў і запісаў. Праведзена сістэматызацыя дакументаў актавых кніг Менскага магістрата другой паловы XVII ст. і складзены вопісы загалоўкаў да іх, якія на сённяшні дзень выкарыстоўваюцца супрацоўнікамі і даследчыкамі ў НГАБ (акт укаранення ад 19.01.2022 г.). Ахарактарызавана

інфарматыўная каштоўнасць дакументаў і запісаў гэтых кніг у вывучэнні гарадскога самакіравання Менска.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Магістрацкія кнігі з’яўляюцца першачарговай крыніцай пры вывучэнні органаў самакіравання Менска з пункту гледжання інфарматыўнасці і дакладнасці іх дадзеных параўнальна з іншымі відамі крыніц. Паўната магістрацкіх кніг як крыніц па гісторыі гарадскога самакіравання абумоўлена тыпам і складам кніг, а таксама іх дачыненнем да органаў самакіравання. Дадзеныя кнігі складаліся з запісаў і дакументаў, якія фіксавалі ажыццяўленне прававых працэдур, што знаходзіліся ў веданні і кампетэнцыі магістрата. Структура дакументаў патрабавала выразнага абазначэння віда прававога дзеяння, рэгламента яго ажыццяўлення, дакладнай фіксацыі яго рэалій з указаннем складу службовых асоб, якія былі адказныя за выкананне і кантраляванне гэтых дзеянняў. Вядзенне названых кніг было складовай часткай сістэмы магдэбургскага права і атрыбутам органа гарадскога самакіравання, магдэбурскага права, прававой сістэмы ВКЛ, уваходзіла ў абавязкі службовых асоб.

2. Кніга спраў вячыстых за 1663–1680 гг. і кніга пратаколаў за 1674–1680 гг. – самыя раннія з комплексу захаваўшыхся магістрацкіх кніг Менска і адзінкавыя за другую палову XVII ст. У кнізе спраў вячыстых 79 % актыкацый з’яўляюцца запісамі здзелак з нерухомасцю жыхароў Менска (сазнанні прадажных, дароўных, застаўных, уліўковых лістоў і інш.). Дакументы іншых відаў, разнавіднасцяў і паходжання прадстаўлены наступным чынам: афармленні фінансавых аперацый менскіх мяшчан (квітацыйныя лісты, облігі, распіскі і інш.) – 10 %; актыкацыі каралеўскіх грамат і дакументаў, якія былі створаны ў выніку адміністрацыйна-распарадчай дзейнасці гарадскіх улад (ухвалы, рэляцыі, інвентары, рэестры, інтрамісіі і інш.) – 5 %; актыкацыі выпісаў з магістрацкіх актавых кніг (Ружан, Заблудава, Круляўца, Нясвіжа) і іншых судовых органаў, а таксама дакументы розных разнавіднасцей, складзеныя ў гарадах і мястэчках ВКЛ па справах менскіх мяшчан – 6%.

Кніга пратаколаў за 1674–1680 гг. складаецца з запісаў, якія фіксуюць ход штотыднёвых сесій Менскага магістрата і судовых слуханняў. Гэтыя запісы змяшчаюць факты аб адміністрацыйна-распарадчай дзейнасці ўраднікаў (кантроль забудовы горада, усталяванне і перанос крам у гарадскім рынку, нагляд за прыладамі вагі і меры, ацэнка кошту маёмасці, агляд месца злачынства, устанаўленне апякунства, запіс тастаментаў і інш.), фінансавых справах (выплата пазыкі, пацвярджэнні

доўгу, зборы і размеркаванні агульнагарадскіх падаткаў і інш.) менскіх мяшчан і здзелках з нерухомай маёмасцю (купля-продаж, падараванне, здача ў арэнду, пераўступка ўладанняў), крымінальных злачынствах (крадзяжы, забойстве, збіцці, грабяжы) і інш. У гэту кнігу таксама ўключаны пратаколы вальных і енеральных сесій, на якіх праводзіліся выбары новыхураднікаў магістрата і вырашаліся галоўныя пытанні кіравання горадам.

3. Спецыфіка менскіх магістрацкіх кніг з пункту гледжання дакументальнага складу абумоўлена іх рознымі функцыямі. Кніга спраў вячыстых за 1663–1680 гг. з’яўлялася сродкам афіцыйнага зацвярджэння дамоваў, якія набывалі прававую сілу ў выпадку ўключэння запісу аб ёй у актавыя кнігі і выдачы адпаведнага выпісу. У гэтай кнізе пераважаюць актыкацыі па справах з нерухомай маёмасцю і фінансавых абавязацельствах, сведчанні натарыяльнага характару. Асаблівую каштоўнасць прадстаўляюць дакументы, якія адлюстроўваюць адміністрацыйна-распарадчую дзейнасць магістрата, а таксама ўпісанні каралеўскіх лістоў.

Кніга пратаколаў за 1674–1680 гг. выконвала пераважна мемарыяльныя функцыі. Яе запісы выкарыстоўваліся для падрыхтоўкі дакументаў, якія ўключаліся ў актавыя кнігі іншых відаў (спраў вячыстых, дэкрэтавыя ці паточныя). Па гэтай прычыне пратакольныя запісы ў сціслай форме адлюстроўваюць усе сферы дзейнасці гарадскога самакіравання, вызначаюць асаблівасці яго функцыянавання ў адзначаны перыяд, а таксама найбольш поўна асвятляюць працоўную дзейнасць ураднікаў і іншых службовых асоб магістрата.

4. Дакументы магістрацкіх кніг за другую палову XVII ст. змяшчаюць асноватворныя і ключавыя факты, неабходныя для рэканструкцыі структуры і дзейнасці Менскага магістрата (арганізацыя, абавязкі ўраднікаў і іх паўнамоцтвы, парадак дзейнасці), вывучэння персанальнага складу службовых асоб (прафесійная прыналежнасць, веравызнанне, сваяцкія сувязі і інш.). Дакладнаць фактаў, адлюстраваных у кнізе спраў вячыстых 1663–1680 гг., абумоўлена тым, што вядзенне гэтай кнігі, форма дакументаў і змешчаных у ёй рэалій падлягалі кантролю з боку розных службовых асоб. Кніга пратаколаў за 1674–1680 гг. з’яўляецца найбольш інфарматыўнай крыніцай у плане даследавання судовай, фінансавай і адміністрацыйна-распарадчай дзейнасці органаў гарадскога самакіравання Менска. Яе запісы з’яўляюцца базавай крыніцай для вывучэння абавязкаў і паўнамоцтваў такіх службовых асоб як гмінныя, паспольства, бірчыя і шафары.

**Асабісты ўклад саіскальніка**

Дысертацыя з’яўляецца самастойна выкананым навуковым даследаваннем. На прыкладзе менскіх магістрацкіх кніг была ўпершыню зроблена комплексная крыніцазнаўчая характарыстыка гэтых дакументаў і запісаў. Саіскальнікам абгрунтавана актуальнасць тэмы, неабходнасць яе вывучэння, пастаўлены і вырашаны мэта і задачы, распрацавана метадалогія і праведзена даследаванне, сфармуляваны высновы. Навуковыя высновы і палажэнні, якія выносяцца на абарону, прайшлі апрабацыю на 16 навуковых канферэнцыях і адлюстраваны ў 16 аўтарскіх публікацыях.

**Апрабацыя дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў**

Вынікі дысертацыйнага даследавання былі прадстаўлены на 16 міжнародных і рэспубліканскіх навуковых і навукова-практычных канферэнцыях: 1) «Мінск і мінчане: 10 стагоддзяў гісторыі (да 510–годдзя атрымання Менскам магдэбургскага права)» (г. Мінск, 4–5 верасня 2009 г.); 2) «Нясвіжскі палац Радзівілаў: гісторыя, новыя даследаванні. Вопыт стварэння палацавых музейных экспазіцый» (г. Нясвіж, 20 кастрычніка 2009 г.); 3) «Навуковыя імкненні – 2010» (г. Мінск, 1–3 лістапада 2010 г.); 4) «Радзівілы ў рэлігійным жыцці, развіцці сакральнай архітэктуры і мастацтва беларускіх зямель XVI – п. тр. XX стст.» (г. Нясвіж, 15 кастрычніка 2010 г.); 5) «Романовские чтения – 7» (г. Магілёў, 26 лістапада 2010 г.); 6) «Моладзь у навуцы–2011» (г. Мінск, 25–29 красавіка 2011 г.); 7) «Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі. Сацыяльныя структуры і паўсядзённасць» (г. Мінск, 15–16 верасня 2011 г.); 8) «Знакамітыя мінчане XIX–XX стст. Постаці і роля жанчын у грамадскім жыцці Мінска і Міншчыны ў XIX – пачатку XX стагоддзя» (г. Мінск, 26 красавіка 2012 г.); 9) «Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі. Да 950–годдзя горада» (г. Мінск, 7–8 верасня 2017 г.); 10) II Канферэнцыя маладых даследчыкаў Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі «ARS LONGA: навуковыя дасягненні і перспектывы (90–годдзю Інстытута гісторыі НАН Беларусі прысвячаецца)» (г. Мінск, 4–5 красавіка 2019 г.); 11) IV міжнародны кангрэс гісторыкаў Беларусі «Гістарычная навука Беларусі: асобы, канцэпцыі, дасягненні (да 90–годдзя Інстытута гісторыі НАН Беларусі)» (г. Мінск, 17–18 кастрычніка 2019 г.), 12) III навукова-практычная канферэнцыя маладых даследчыкаў Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі «ARS LONGA: навуковыя дасягненні і перспектывы» (г. Мінск, 21 мая 2020 г.), 13) Міжнародная навукова–

практычная канферэнцыя «Метадалогія гістарычнага даследавання: дасягненні, праблемы, перспектывы» (г. Мінск, 5–6 лістапада 2020 г.), 14) IV міжнародная навукова-практычная канферэнцыя маладых даследчыкаў Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі «ARS LONGA: навуковыя дасягненні і перспектывы» (г. Мінск, 14–16 красавіка 2021 г.); 15) Международная научная конференция «Пичетовские чтения – 2021: 100 лет первому государственному университету Беларуси», (г. Минск, 27–28 октября 2021 г), 16) «Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі (да 955-годдзя горада)» (г. Минск, 9–10 сентября 2022 г.).

Матэрыялы дысертацыйнага даследавання былі выкарыстаны для падрыхтоўкі новых экскурсійных маршрутаў па экспазіцыі мінскай гарадской ратушы, а таксама для падрыхтоўкі тэматычных экскурсій па гістарычнаму цэнтру Мінска (акт укаранення ад 17.09.2021 г.). Вопісы загалоўкаў дакументаў кнігі спраў вячыстых за 1663–1680 гг. выкарыстоўваюцца ў працы НГАБ (акт укаранення ад 19.01.2022 г.)

**Апублікаванасць вынікаў даследавання**

Асноўныя вынікі дысертацыйнага даследавання знайшлі адлюстраванне ў 16 аўтарскіх публікацыях. У іх ліку 5 артыкулаў у навуковых выданнях, рэкамендаваных ВАК Рэспублікі Беларусь (2,9 а.а.), 11 – у іншых навуковых зборніках і матэрыялах навуковых канферэнцый (4,2 а.а.). Агульны аб’ём публікацый складае 7,1 а.а.

**Структура і аб’ём дысертацыі**

Структурны падзел дысертацыі абумоўлены мэтай і задачамі даследавання. Дысертацыя складаецца са спіса скарачэнняў; уводзінаў; агульнай характарыстыкі працы; пяці глаў, падзеленых на асобныя падпункты; заключэння; спіса выкарыстаных крыніц і дадаткаў. Агульны аб’ём дысертацыі складае 159 старонак, 10 дадаткаў займаюць 27 старонак. Бібліяграфічны спіс утрымлівае 133 пазіцыі, уключаючы публікацыі аўтара.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ

У **першым раздзеле першай главы «Гістарыяграфія і крыніцы. Метадалогія даследавання»** пададзены агляд літаратуры і прац, змест якіх закранае розныя аспекты прадмета даследавання.

Вывучэнне актавых кніг магістратаў беларускіх гарадоў як асобнага комплексу крыніц, а таксама інфарматыўнага патэнцыялу іх дакументаў у айчыннай гістарыяграфіі пачалося толькі ў апошнія два дзесяцігоддзі. Менскія магістрацкія кнігі ў пэўнай меры і раней выкарыстоўваліся

гісторыкамі пры вывучэнні сацыяльна-эканамічных і палітычных працэсаў у гісторыі Мінска[2]. Аднак не існавала іх крыніцазнаўчага апісання, а самі кнігі не выступалі як прадмет для асобнага даследавання. На мяжы XX і XXI стст. першым звярнуў увагу на магістрацкія кнігі як галоўную крыніцу па гісторыі самакіравання Полацка М.Ю. Гардзееў[3]. Вывучэнне і публікацыя полацкіх магістрацкіх кніг канца XVI–XVIII стст. было працягнута М.Дз. Макаравым[4]. Пытанне крыніцазнаўчай вартасці актавых кніг Ружанскага магістрата за другую палову XVII ст. было закранута С.П. Стрэнкоўскім[5]. Гарадское самакіраванне і асобныя разнавіднасці дакументаў дзісненскіх магістрацкіх кніг вывучаў А.В. Грыб[6]. Дакументы кнігі бурмістра-радзецкага суда Гарадзенскага магістрата за 1639–1642 гг. былі выкарыстаны пры даследаванні пытання суадносінаў судовай практыкі з магдэбургскім правам Н.Ул. Сліж[7]. На актах з кніг Гарадзенскага магістрата за XVII–XVIII стст. базуюцца артыкулы В.В. Урублеўскага і З.Л. Яцкевіча[8].

Польскія даследчыкі звярнулі ўвагу на магістрацкія кнігі яшчэ ў канцы XIX – пачатку XX ст. Яны шырока выкарыстоўвалі іх дакументы для напісання прац па гісторыі самакіравання. Так, гарадскія кнігі Бельжыц XVI–XVIII стст. вывучаў Я. Ласоўскі[9]. Арганізацыя гарадской канцылярыі Варшавы стала прадметам даследавання З. Гурскага[10], Кракава

[2] Дружчыц, В. Д. Магістрат у беларускіх местах з магдэбургскім правам у XV–XVII стст. / В. Д. Дружчыц. – [Мінск : Друк. Беларус. акад. навук, 1929?]. – 31 с.; Капыскі, З. Ю. З гісторыі грамадска-палітычнага жыцця гарадоў Беларусі ў XVI – першай палове XVII стст. / З. Ю. Капыскі // Тр. Ин-та истории /Акад. наук. Белорус. ССР. – Минск, 1958. – Вып. 3 : Досоветский период. – С. 15–46; Карпачев, А. М. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии во второй половине XVII–XVIII вв. : дис. ... д-ра ист. наук : 571 / А. М. Карпачев. – Минск, 1969. – 661 л.

[3] Гардзееў, М. Ю. Полацкія магістрацкія кнігі 2-й паловы XVII ст. як гістарычная крыніца / М. Ю. Гардзееў // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі : матэрыялы III Міжнар. навук. канф., Полацк, 21–23 крас. 1997 г. / Полац. гіст.-культ. музей-запаведнік, Полац. дзярж. ун-т ; уклад. Т. А. Джумантаева. – Полацк, 1998. – С. 76–79.

[4] Макараў, М. Асноўныя вынікі вывучэння органаў самакіравання магдэбургскага Полацка / М. Макараў // Гістарыяграфія і крыніцы па гісторыі гарадоў і працэсаў урбанізацыі ў Беларусі : зб. навук. арт. / Гродзен. дзярж. ун-т ; рэдкал.: В. В. Даніловіч (адк. рэд.) [і інш.]. – Гродна, 2009. – С. 175–182.

[5] Стрэнкоўскі, С. П. Актавая кніга Ружанскага магістрата як крыніца па гісторыі гарадскога самакіравання / С. П. Стрэнкоўскі // Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі / Нац. б-ка Беларусі. – Мінск, 2012. – Вып. 14 : Да 90-годдзя Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. – С. 72–83.

[6] Грыб, А. В. Дзісненскі магістрат: структура і функцыі (паводле актавых кніг перыяду Рэчы Паспалітай) / А. В. Грыб // Архіварыус : зб. навук. паведамл. і арт. / Дэпартамент па арх. і справаводству М-ва юстыцыі Рэсп. Беларусь, Нац. гіст. арх. Беларусі. – Мінск, 2012. – Вып. 10. – С. 155–168.

[7] Сліж, Н. Гарадзенскі бурмістраўска-радзецкі суд: суадносіны судовай практыкі з магдэбургскім правам (1639–1642 гады) / Н. Сліж // Гісторыя: літаратура, права, палітыка : [зб. арт.] / Ін-т паліт. даслед. «Паліт. сфера», Ун-т Вітаўта Вялікага, Ін-т ВКЛ. – Мінск ; Вільня, 2014-2015. – С. 35–51. – (Палітычная сфера ; № 22/23).

[8] Яцкевіч, З. Гарадзенскі магістарат у XVII ст. / З. Яцкевіч, В. Урублеўскі // Гарадзенскі палімпсест, 2009. Дзяржаўныя ўстановы і палітычнае жыццё, XV–XX стст. / пад рэд. А. Ф. Смаленчука, Н. У. Сліж. – Гародня, 2009. – С. 75–117.

[9] Łosowski, J. Księgi miejskie Bełżyc (XVI–XVIII w.) / J. Łosowski // Archeion. – 1989. – T. 86. – S. 33–62.

[10] Górski, Z. Organizacja kancelarii mieskiej Starej Warszawy i system pracy pisarzy miejskich / Z. Górski // Archeion. – 1983. – T. 76. – S. 19–36.

і Казімежа – М. Фрэдберга[11]. Сярод іх можна вылучыць працу Я. Тандэцкага, якая прысвечана аналізу не толькі гарадскога ладу і канцылярыі, але і актавых кніг Торуня, Гданьска, Круляўца, Эльбланга, Бранева, Хэльмна як гістарычных крыніц і помнікаў мяшчанскай культуры[12].

Украінскімі навукоўцамі на сённяшні дзень даследаваны крыніцы па гісторыі самакіравання Кіева, Львова, Чарнігава, Луцка і інш[13]. У іх вызначана як галоўная роля дакументаў кніг, створаных у канцылярыі гарадскога самакіравання, так і ўмовы ўключэння іншых крыніц у даследаванне ў выпадку іх дрэннай захаванасці. У напрамку публікацыі магістрацкіх кніг плённа працуюць літоўскія даследчыкі[14]. Вывучэнне магістрацкіх кніг, як крыніц па гісторыі самакіравання горада, асобна імі не праводзілася.

Такім чынам, менскія магістрацкія кнігі за другую палову XVII ст. да гэтага часу не выступалі як асобны аб’ект даследавання. Не вывучаны пытанні арганізацыі і дзейнасці Менскага магістрата ў адзначаны перыяд. Гэта пацвярджае неабходнасць увядзення ў навуковы абарот матэрыялаў менскіх магістрацкіх кніг, а таксама іх вывучэнне як асобнага комплексу дакументальных крыніц, які склаўся ў працэсе працы органа гарадскога самакіравання.

**У раздзеле 1.2** раскрываецца спецыфіка дакументальнай базы дадзенага даследавання і методыка працы з ёй. Метадалагічнай асновай дысертацыйнага даследавання з’яўляюцца прынцыпы аб’ектыўнасці, гістарычнай каштоўнасці, сістэмнасці і гістарызму. Выкарыстоўваліся таксама спецыяльныя метады дапаможных гістарычных дысцыплін крыніцазнаўчага цыкла: дыпламатыкі, палеаграфіі і кадыкалогіі.

---

[11]Friedberg, M. Kancelaria miasta Krakowa do połowy XVIII wieku / M. Friedbierg // Archeion. – 1955. – T. 24. – S. 277–304; Friedberg, M. Kancelaria miasta Kazimierza pod Krakowem 1335–1802 / M. Friedbierg // Archeion. – 1962. – T. 36. – S. 137–170.

[12] Tandecki, J. S. Średniowieczne księgi wielkich miast pruskich jako źródła historyczne i zabytki kultury mieszczańskiej: organizacja władz, zachowane archiwalia, działalność kancelarii / J. S. Tandecki. – Warszawa ; Toruń : Inst. Sztuki Pol. Akad. Nauk, 1990. – 273 s.

[13] Білоус, Н. О. Документальні джерела з історії магдебурзького права в Києві / Н. О. Білоус // Самоврядування в Києві: історія та сучасність : матеріали міжнар. конф. присвяч. 500-річчю надання Києву магдебурз. права, Київ, 26–27 листоп. 1999 р. / Київс. міськрада, Фонд ім. Ф. Еберта ; редкол.: В. І. Андрійко [та ін.]. – Київ, 2000. – С. 101–107; Доманова, Г.С. Актові книги Чернігівського магістрату / Г.С. Доманова // Література та культура Полісся. – Ніжин, 2002. – Вип. 21. – С. 48–52; Штанько, О. Ф. Луцький магістрат XVI – першої половини XVII століття : автореф. дис. … канд. іст. наук : 07.00.01 / О. Ф. Штанько ; Східноєвроп. нац. ун-т. – Луцьк, 2015. – 20 с.; Кіселичник, В. Львівське міське право: поняття, джерела, періодизація та зміст / В. Кіселичник // Вісн. Львівс. Ун-ту. Сер. юрид. – 2004. – Вип. 39. – С. 102–110.

[14] Tarybos knyga, 1568-1570/1571 = Liber Consularis, 1568-1570/1571 / Liet. ist. inst.; par. D. Antanavičius. – Vilnius: Liet. ist. inst. leidykla, 2015. – 292 p.; Kauno miesto aktų knygos, XVI–XVIII a.: Vaito knyga, 1561–1564=Acta civilia Caunensia saec. XVI–XVIII, Liber Advocatialis, 1561–1564, par. D. Antanavičius, L. Plankis. – Vilnius: Liet. ist. inst. leidykla, 2013. – 528 p.; XVII a. vidurio Maskvos okupacijos Lietuvoje šaltiniai : [4 t.] / sud. E. Meilus ; Liet. ist. inst. – Vilnius : Liet. ist. inst. leidykla, 2011–2016.

**Другая глава «Кадыкалагічнае апісанне кніг Менскага магістрата другой паловы XVII ст.»** складаецца з чатырох раздзелаў. **Раздзел 2.1 «Гісторыя захавання комплексу менскіх магістрацкіх кніг»** прысвечаны даследаванню гісторыі архіва органа гарадскога самакіравання Менска. Устаноўлены прычыны адсутнасці магістрацкіх кніг за канец XVI – першую палову XVII стст. і дрэннай захаванасці актавых кніг за другую палову XVII ст. Выяўлены і ідэнтыфікаваны 15 аркушаў з дакументамі за 1677 г., якія былі выключаны з кнігі спраў вячыстых Менскага магістрата за 1663–1680 гг. і памылкова падшыты ў актавую кнігу Бельскага гродскага суда.

**У раздзеле 2.2 «Апісанне кнігі пратаколаў за 1674–1680 гг.»** на падставе аналізу філіграней аркушаў кнігі ўстаноўлена подлінасць яе запісаў і прыналежнасць да комплексу кніг, створаных у канцылярыі магістрата Менска ў другой палове XVII ст. Удакладнены храналагічны перыяд упісання пратаколаў у параўнанні з пазначэннем на вокладцы кнігі. **У раздзелах 2.3 «Апісанне першай часткі кнігі запісаў (спраў вячыстых) за 1663–1677 гг.»** і **2.4 «Апісанне другой часткі кнігі запісаў (спраў вячыстых) за 1677–1680 гг.»** праведзены кадыкалагічны аналіз архіўных спраў № 1 і № 54 фонда 1816 «Мінскі магістрат». Паводле ацэнкі знешняга выгляду аркушаў, почыркаў пісараў і філіграней, а таксама відавай разнастайнасці іх дакументаў установлена, што яны з'яўляюцца часткамі адной актавай кнігі спраў вячыстых за 1663–1680 гг. Аналіз вадзяных знакаў абедзвюх частак кніг сведчыць, што час вырабу паперы, выкарыстанай пры стварэнні кнігі, не супярэчыць даце яе стварэння.

**У трэццяй главе «Кніга пратаколаў за 1674–1680 гг. як крыніца па гісторыі Менскага магістрата»** прадстаўлены вынікі аналізу крыніцазнаўчага патэнцыялу яе запісаў. Адзначаецца, што пратаколы пасяджэнняў з'яўляюцца змястоўнай і рэпрэзентатыўнай групай крыніц, на аснове якой магчыма даследаваць структуру, арганізацыю і асноўныя напрамкі дзейнасці гарадскога самакіравання Менска ў адзначаны перыяд.

У **раздзеле 3.1 «Склад ураднікаў Менскага магістрата і іх службовыя абавязкі»** прааналізавана інфарматыўнасць запісаў кнігі пратаколаў за 1674–1680 гг., якія змяшчаюць звесткі аб персанальным складзе ўраднікаў і ўказваюць на пэўныя катэгорыі іх службовых абавязкаў. На падставе пратакольных запісаў аб прысутных на пасяджэннях вызначана, што ў другой палове XVII ст. магістрат Менска не быў падзелены на бурмістраўска-радзецкую і войтаўска-лаўнічую часткі. Устаноўлены колькасны і персанальны склад гадавых ураднікаў Менскага магістрата ў вывучаемы перыяд.

**Падраздзелы 3.1.1 «Бурмістры»** і **3.1.2 «Райцы і лаўнікі»** прысвечаны аналізу паўнаты звестак аб гэтых урадніках. У запісах за 1674–1680 гг. фіксуецца па два гадавых бурмістры, райцы і лаўнікі на кожныя тры гады. Паводле пратаколаў выбараў і прызначэння на пасады, бурмістры ў адзначаны час выбіраліся з ліку райцаў (у выключных выпадках – лаўнікаў), райцы – з лаўнікаў каталіцкага і ўніяцкага веравызнання, і займалі свае пасады пажыццёва. Што датычыцца іх службовых абавязкаў, то разнастайная тэматыка пратакольных запісаў кнігі дазваляе правесці іх падрабязную характарыстыку.

**Падраздзел 3.1.3 «Іншыя службовыя асобы»** прысвечаны аналізу паўнаты дадзеных аб іншых службовых асобах гарадскога самакіравання ў магістрацкіх кнігах. Пратаколы штотыднёвых пасяджэнняў сведчаць аб скліканні на кожнае з іх мужоў гмінных, цэхмістраў і паспольства. У запісах таксама называюцца іх прафесійная і канфесійная прыналежнасць, сустракаюцца звесткі аб узросце і роднасных адносінах, адукацыі. Кніга пратаколаў за 1674–1680 гг. з’яўляецца адной з нямногіх крыніц, дзе сустракаюцца сведчанні аб персаналіях і службовых абавязках шафараў, інстыгатараў, слуг мейскіх, бірчых.

**У раздзеле 3.2 «Выбары ў склад Менскага магістрата і падзел урадніка ў паводле канфесійнай прыналежнасці»** прадстаўлены вынікі пошуку і аналізу інфармацыі аб выбарах у Менскі магістрат, а таксама падзеле ўраднікаў паводле канфесійнай прыналежнасці. Звесткі такога характару часцей за ўсё ўносіліся ў пратаколы сесій на пачатку новага года. Гісторыка-параўнальны аналіз указаных запісаў кнігі сведчыць, што ў дадзены перыяд бурмістры, райцы і лаўнікі выбіраліся з католікаў і ўніятаў, гмінныя – з католікаў, уніятаў і праваслаўных у роўнай колькасці. Пратаколы сесій таксама ўтрымліваюць звесткі, якія дазваляюць вызначыць тэрмін знаходжання на пасадзе розных катэгорый ураднікаў і службовых асоб, прычыны іх звальнення і прыцягнення да адказнасці ў выпадку злоўжывання паўнамоцтвамі.

**У раздзеле 3.3 «Месца для правядзення сходаў і тэрмін збору магістрата»** адзначана выключная важнасць пратакольных запісаў для рэканструкцыі дзейнасці Менскага магістрата. Кніга пратаколаў за 1674–1680 гг. з’яўляецца адзінай крыніцай, дзе зафіксаваны дакладныя звесткі аб днях правядзення сесійных і судовых сходаў. Пры сінтэзаваным выкарыстанні адзначаных запісаў магчыма прааналізаваць частату склікання, прычыны пераносу і правядзення па-за планавых збораў, устанавіць даныя аб часе пачатку пасяджэнняў і інш.

**Раздзел 3.4 «Функцыі магістрата»** складаецца з двух падраздзелаў. У **падраздзеле 3.4.1 «Судаводства»** на падставе аналізу пратакольных запісаў вызначаны іх паўната і дакладнасць, неабходныя для вывучэння парадку правядзення сходаў гарадскога самакіравання Менска па судовых пытаннях. У пратаколах судовых сходаў зафіксавана абавязковая прысутнасць на іх войта ці яго намесніка лантвойта. У запісах такога характару абавязкова называюцца прычыны адмены судоў і перанакіравання спраў у іншыя судовыя ўстановы, а таксама акрэслены абавязкі прысутных членаў магістрата, войта (лантвойта) і адлюстраваны характар пытанняў, якія выносіліся на абмеркаванне.

**У падраздзеле 3.4.2 «Адміністрацыйна-распарадчая дзейнасць»** ахарактарызаваны напрамкі адміністрацыйна-распарадчай дзейнасці Менскага магістрата, на якія ўказваюць пэўныя запісы кнігі пратаколаў за 1674–1680 гг. Устаноўлена, што для вывучэння гэтага пытання найбольшую цікавасць прадстаўляюць пратаколы пасяджэнняў на пачатку года і штотыднёвых аўторкавых сесій на працягу года, на якіх разглядаліся шматлікія справы па кіраванні горадам.

У **чацвёртай главе «Дакументальны склад кнігі запісаў (спраў вячыстых) за 1663–1680 гг.»** праведзена сістэматызацыя ўваходзячай і зыходзячай дакументацыі паводле відавай і тэматычнай разнастайнасці. У некаторых выпадках дакументы зведзены ў групы па відаваму падабенству (напрыклад, рэестры і інвентары нерухомасці), у іншых – аб’яднаныя па прыкмеце тэматычнай блізкасці (напрыклад, дакументы па гісторыі рамяства). Ахарактарызаваны тыпавыя разнавіднасці дакументаў актавай кнігі спраў вячыстых за адзначаны перыяд і іх інфарматыўнасць.

У **раздзеле 4.1 «Уваходзячая дакументацыя магістрата»** прадстаўлены вынікі даследавання ўваходзячай дакументацыі, якая па розных прычынах паступала ў магістрат з дзяржаўных установаў ці ад упаўнаважаных асоб (каралеўскія лісты, лісты войта, справаздачы енералаў і інш.). У кнізе спраў вячыстых за 1663–1680 гг. такіх запісаў няшмат. З іх найбольшую цікавасць прадстаўляюць актыкацыі каралеўскіх лістоў.

**У раздзеле 4.2 «Дакументы магістрата па арганізацыі кіравання горадам»** засяроджана ўвага на дакументах, якія былі складзены ўраднікамі пры выкананні сваіх службовых абавязкаў па арганізацыі кіравання горадам: ухвалы, рознага тыпу справаздачы, рэестры, інвентары і інш. Устаноўлена ступень іх паўнаты і дакладнасці пры вывучэнні арганізацыі і функцыянавання органа гарадскога самакіравання Менска.

У **падраздзеле 4.2.1 «Дакументы па афармленні здзелак з нерухомай маёмасцю»** разгледжаны акты, якія былі створаны пры

афармленні здзелак з нерухомай маёмасцю. Паводле складзенага вопісу загалоўкаў да дакументаў кнігі, яны вызначаны як найбольшая па колькасці група крыніц. Разнастайныя віды дакументаў па афармленні здзелак з нерухомай маёмасцю адлюстроўваюць розныя катэгорыі службовых абавязкаўураднікаў і дапаможнага персанала Менскага магістрата, бо звязаны з выкананнем устаноўленых працэдур па іх рэгістрацыі і прывядзенні ў дзеянне. Яны таксама ўтрымліваюць вялікі пласт інфармацыі аб персаналіях ураднікаў за ўказаны перыяд і ўрыўкавыя звесткі аб складзе Менскага магістрата за першую палову XVII ст., а таксама маёмасным стане і роднасных адносінах службовых асоб гарадскога самакіравання.

У **падраздзеле 4.2.2 «Дакументы па афармленні аперацый па фінансавых пытаннях»** абагульнены дадзеныя аб інфарматыўнасці дакументаў, створаных у выніку рэгістрацыі аперацый фінансавага характару. Гэта другая па колькасці група крыніц кнігі спраў вячыстых за 1663–1680 гг. Як і дакументы па справах з нерухомай маёмасцю, яны прадстаўляюць цікавасць пры вывучэнні персанальнага складу, службовых абавязкаў, прафесійнага і маёмаснага стану ўраднікаў, іх сямейных сувязей.

У **падраздзеле 4.2.3 «Дакументы па крымінальных справах»** разгледжаны некалькі дакументаў, якія не з’яўляюцца характэрнымі для кнігі спраў вячыстых. Устаноўлены прычыны іх актыкацыі.

У **падраздзеле 4.2.4 «Дакументы па арганізацыі дзейнасці рамесных аб’яднанняў»** праведзены аналіз інфарматыўнасці яшчэ адной групы актаў, у якіх змешчана вялікая колькасць персанальных дадзеных аб рамесніках. Яны прадстаўляюць цікавасць пры даследаванні прафесійнай прыналежнасці ўраднікаў Менскага магістрата.

**Пятая глава «Кніга запісаў (спраў вячыстых) за 1663–1680 гг. як крыніца па гісторыі Менскага магістрата»** ўключае чатыры раздзелы. У **раздзеле 5.1 «Персанальны склад ураднікаў Менскага магістрата»** вызначаны спецыфічныя рысы інфарматыўных магчымасцяў дакументаў кнігі ў высвятленні персанальнага складу гарадскога ўрада за 1663–1680 гг. Устаноўлена, што ў гэты час ён выглядаў адносна стабільным, а кола мяшчанскіх сем’яў, з якіх выбіраліся службоўцы, было пастаянным. На падставе даных з актаў кнігі спраў вячыстых магчыма вызначыць роднасныя сувязі паміж ураднікамі, а таксама атрымаць звесткі аб складзе магістрата за ранейшы перыяд.

У **раздзеле 5.2 «Звесткі аб іншых службовых асобах»** засяроджваецца ўвага на інфарматыўным патэнцыяле дакументаў кнігі

спраў вячыстых за 1663–1680 гг. пры даследаванні дапаможнага персаналу гарадскога самакіравання. Высветлена, што звесткі аб мужах гмінных, інстыгатарах, цэхмістрах, пісарах і інш. часцей сустракаюцца ў тэкстах дакументаў, дзе яны выступалі ў якасці ўдзельнікаў справы, сведкамі зацвярджэння здзелкі ці ў апісаннях месцазнаходжання нерухомасці.

У **раздзеле 5.3 «Службовыя абавязкі ўраднікаў»** дадзена характарыстыка службовых абавязкаў бурмістраў, райцаў і лаўнікаў, якія адлюстраваны ў шматлікіх разнавіднасцях дакументаў кнігі спраў вячыстых за 1663–1680 гг. Важнымі крыніцамі для вывучэння гэтага пытання з’яўляюцца групы актаў, што былі створаны пры выкананні членамі магістрата ўскладзеных на іх даручэнняў па арганізацыі кіравання горадам: ухвалы, рэляцыі, інтрамісіі, рэестры, інвентары і інш.

У **раздзеле 5.4 «Функцыі магістрата»** прааналізавана паўната і даставернасць дакументаў кнігі пры вывучэнні пытання функцыянавання органа гарадскога самакіравання Менска. У **падраздзеле 5.4.1 «Судаводства»** на падставе аналізу дакументаў кнігі вызначана, што справы па крымінальных злачынствах у кнізе спраў вячыстых за 1663–1680 гг. прадстаўлены ў адзінкавых запісах. Ахарактарызаваны разнавіднасці дакументаў, якія змяшчаюць даныя аб судовай дзейнасці магістрата, і прадстаўлены вынікі аналізу іх інфарматыўнасці.

У **падраздзеле 5.4.2 «Адміністрацыйна-распарадчая дзейнасць»** прадстаўлены вынікі даследавання арганізацыі дзейнасці Менскага магістрата па разнабаковых пытаннях кіравання горадам. Вызначана, што ў апрацаваным корпусе крыніц кнігі спраў вячыстых за 1663–1680 гг. пераважае інфармацыя па фіскальнай і натарыяльнай дзейнасці гарадскога ўрада, здзяйсненні ім кантролю за гандлем і вытворчасцю, а таксама ўпарадкаваннем, забудовай і цэласнасцю тэрыторыі гарадской юрыдыкі, прадстаўленні інтарэсаў горада па-за яго межамі.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі:

1. Паўната магістрацкіх кніг як крыніц па гісторыі гарадскога самакіравання Менска абумоўлена тыпам і складам кніг, а таксама іх адносінамі да органаў гэтага самакіравання. Дадзеныя кнігі складаліся з запісаў і дакументаў, якія фіксавалі ажыццяўленне прававых працэдур, што знаходзіліся ў веданні і кампетэнцыі органаў самакіравання. Структура ўказаных дакументаў патрабавала выразнага абазначэння віда прававога дзеяння, рэгламента яго ажыццяўлення, дакладнай фіксацыі яго

рэалій з указаннем складу службовых асоб, якія былі адказныя за выкананне і кантраляванне гэтых дзеянняў. Вядзенне названых кніг было складовай часткай і атрыбутам інстытута самакіравання, магдэбурскага права, прававой сістэмы ВКЛ, уваходзіла ў абавязкі службовых асоб. Усё гэта робіць магістрацкія кнігі Менска першачарговай крыніцай у вывучэнні органаў самакіравання з пункту гледжання інфарматыўнасці і дакладнасці іх дадзеных параўнальна з іншымі відамі крыніц.

На сённяшні дзень у НГАБ захоўваецца 21 актавая кніга Менскага магістрата за перыяд 1663–1795 гг. і 32 кнігі разнастайных пратаколаў і рэестраў у асноўным за XVIII ст. Актавая кніга спраў вячыстых за 1663–1680 гг. з'яўляецца самай ранняй з захаваўшыхся кніг, створаных у канцылярыі Менскага магістрата ў другой палове XVII ст. У ходзе даследавання ўстаноўлена, што пры рэстаўрацыі ў канцы 60-х – пачатку 70-х гг. XX ст. кніга была падзелена на дзве часткі (першая частка – за перыяд 26 мая 1663 – 14 лютага 1677 гг. (справа № 1 фонда №1816), а другая частка за 6 верасня 1677 – 7 лістапада 1680 гг. (справа № 54 фонда №1816)). Акрамя гэтага, знойдзены яшчэ дзевяць дакументаў і адзін фрагмент запісу за перыяд 25 лютага 1677 – 16 верасня 1677 гг. (усяго на 15 аркушах) з актавай кнігі спраў вячыстых за 1663–1680 гг., якія былі памылкова падшыты сучаснымі рэстаўратарамі ў актавую кнігу Бельскага гродскага суда. І наадварот, вызначаны чатыры дакументы за 1642 г. у першай частцы кнігі спраў вячыстых за 1663–1677 гг., якія былі ўнесены сюды ў час рэстаўрацыі справы з кнігі Менскага гродскага суда.

Паводле аналізу дакументаў актавай кнігі спраў вячыстых за 1663–1680 гг. устаноўлена, што яе аркушы доўгі час захоўваліся ў фасцыкулах, згрупаваных згодна з тэматыкай запісаў, і былі падшытыя ў адзіную кнігу не раней за 1683 г. Пераважная большасць дакументаў была створана ў канцылярыі Менскага магістрата ў другой палове XVII ст. Сустракаюцца нешматлікія актыкацыі выпісаў з магістрацкіх актавых кніг Ружан, Заблудава, Круляўца, Наваградка і Нясвіжа, дваровых кніг Волпы, кніг Галоўнага Трыбунала ВКЛ, Менскага гродскага і Ковенскага лантвойтаўскага судоў, а таксама дакументы, складзеныя ў Калтынянах, Ваўкавыску, Варшаве, Вільні і мястэчку Мір. Паўторна ўнесены копіі дакументаў з актавых кніг Менскага магістрата за 1623, 1625, 1634, 1635, 1645, 1647, 1652, 1653, 1655, 1657, 1661, 1662 гг. У першай частцы кнігі спраў вячыстых налічваецца 416 дакументаў за 1663–1677 гг., у другой – 125 дакументаў за 1677–1680 гг. Храналагічна кніга спраў вячыстых за 1663–1680 гг. напоўнена нераўнамерна. Так, за 1663 г. актыкавана 28 дакументаў і запісаў, за 1664 г. – 20, 1665 г. – 34, за

1666 г. – 43, за 1667 г. – 49, за 1668 г. – 36, за 1669 г. – 33, за 1670 г. – 44, за 1671 г. – 26, за 1672 г. – 10, за 1673 г. – 33, за 1674 г. – 20, за 1675 г. – 21, за 1676 г. – 15, за 1677 г. – 17, за 1678 г. – 35, за 1679 г. – 36, за 1680 г. – 41. Мова актыкацыі дакументаў кнігі – сярэднепольская, шаснаццаць дакументаў упісаны на старабеларускай, тры – на лацінскай мовах [4; 6; 9; 14].

2. Кніга пратаколаў Менскага магістрата за 7 красавіка 1674 – 17 чэрвеня 1680 гг. – гэта каштоўны комплекс гістарычных крыніц, якія маюць самастойнае значэнне як крыніцы па гісторыі Менска другой паловы XVII ст. і як крыніцы, якія асвятляюць паўсядзённую дзейнасць магістрата – галоўнага органа самакіравання горада. Кніга складаецца з кароткіх пратаколаў спраў на 156 аркушах, якія разглядаліся кожны тыдзень на судовых і сесійных пасяджэннях Менскага магістрата. Некаторыя запісы займаюць па памеры адзін радок, самыя вялікія – не болей за палову старонкі. Як паказвае параўнаўчы аналіз абедзвюх захаваўшыхся менскіх магістрацкіх кніг за перыяд 1674–1680 гг., у кнізе пратаколаў прысутнічаюць запісы сціслых пераказаў спраў, што пазней дубліраваліся ў развернутым выглядзе ў пэўныя магістрацкія актавыя кнігі (спраў вячыстых, дэкрэтавыя і паточныя) згодна з тэматыкай запісаў.

Пратаколы менскай магістрацкай кнігі за 1674–1680 гг. можна падзяліць на запісы па справах адміністрацыйна-распарадчай і натарыяльнай дзейнасці ўраднікаў, кантролю за забудовай горада (як жылых памяшканняў, так і месцазнаходжаннем крамаў у гарадскім рынку і інш.), запісы спраў крымінальнага характару, узнікшыя ў выніку судовай дзейнасці магістрата (разгляд спраў аб крадзяжы, забойстве, збіцці, аглядзе месца злачынства), нагляд за прыладамі вагі і меры ў рамеснікаў, а таксама ацэнка вартасці і кошту пэўных рэчаў і маёмасці, устанаўленне апякунства, складанне тастаментаў, заслухоўванне прысягі мяшчан, новаабраных ураднікаў і іншых службовых асоб, вырашэнне цэхавых спрэчак, унутраных пытанняў функцыянавання гарадскога самакіравання і інш.), запісы па фінансавых справах як Менскага магістрата, так і ўласна менскіх мяшчан (выплата пазыкі, пацвярджэнне доўгу, збор і размеркаванне агульнагарадскіх падаткаў, выплата грошай у дзяржаўны скарб і інш.), запісы здзелак менскіх мяшчан з нерухомай маёмасцю (купля-продаж, падараванне, здача ў арэнду, пераўступка зямельных уладанняў ці гаспадарчых пабудоў, увядзенне ва ўладанне нерухомай маёмасцю) і інш.

У адрозненні ад дакументаў кнігі спраў вячыстых за 1663–1680 гг. у кнізе пратаколаў за 1674–1680 гг. няма акрэсленага фармуляра запісаў, аднак пэўнага шаблону ў напісанні і афармленні пісар усё ж

прытрымліваўся. У пачатку запісу пратакола кожнага схода пасярод радка перад асноўным тэкстам праставлялася дата, часам пасля яе ўказваўся год (на пачатку новага года дацiроўка праставлялася абавязкова), дзень тыдня, а з чырвонага радка ўносіўся спіс прысутных на пасяджэнні строга па іерархіі пасадаў. Тэкст пратаколаў пісар імкнуўся раздзяліць тэматычна, таму кожную справу, якая разглядалася на сходзе гарадскога самакіравання, пачынаў з новага радка. Пры ўпісанні дэкрэтавых пастаноў, слова «дэкрэт» з вялікай літары выносілася на сярэдзіну радка і такім чынам адасабляла запіс з рашэннемураднікаў. Пасля тэксту дэкрэта іншая справа ўпісвалася з чырвонага радка ці з водступам альбо наогул падкрэслівалася рысай. Вялікая колькасць слоў і імёнаў (часцей гэта імёны ўраднікаў магістрата) унесена пісарам у скарочаным выглядзе. Мова кнігі – сэрэднепольская, таксама выкарыстоўваліся словы і словазлучэнні юрыдычнага характару на лацінскай мове, трапляюцца ўласныя подпісы службовых асоб магістрата і мяшчан, адзін з якіх на старабеларускай мове [1; 8; 11].

3. На ўзровень інфарматыўнасці менскіх магістрацкіх кніг уплывае ў першую чаргу характар унесеных у іх дакументаў і запісаў. Спецыфіка кнігі спраў вячыстых за 1663–1680 гг. і кнігі пратаколаў за 1674–1680 гг. з пункту гледжання іх дакументальнага складу абумоўлена рознымі функцыямі гэтых кніг. Першая кніга з’яўлялася сродкам афіцыйнага зацвярджэння дамоваў. Дамова набывала прававую сілу ў выпадку ўключэння запісу аб ёй у актавыя кнігі і выдачы адпаведнага выпісу. Так, большую частку актыкацый кнігі спраў вячыстых за 1663–1680 гг. складаюць дакументы па справах з нерухомай маёмасцю: лісты на яе продаж, падараванне, заставу, арэнду, пераўступку і інш. Наступнымі па колькасці з’яўляюцца запісы здзелак па фінансавых справах менскіх мяшчан. Сярод іх квітацыйныя лісты аб выплаце пазыкі, аб прызнанні доўгу ці скаргі аб яго невяртанні, аб перадачы каштоўных папер новаму ўладальніку і інш. Аднак, нягледзячы на пераважную большасць актыкацый сацыяльна-эканамічнага характару, дакументы кнігі спраў вячыстых за 1663–1680 гг. змяшчаюць каштоўную інфармацыю па персанальнаму складу ўраднікаў і некаторых іншых службовых асоб Менскага магістрата, а таксама іх службовых абавязках у адзначаны перыяд. Так, у інтытуляцыі дакументаў уносіліся імёны прысутных на пасяджэнні гадавых ураднікаў (бурмістраў, райцаў і часам лаўнікаў) ці асобаў, што іх замянялі, а таксама менскага войта (альбо яго намесніка) і ў некалькіх выпадках мужоў гмінных, цэхмістраў, прадстаўнікоў ад паспольства. Трэба ўлічваць таксама шырэйшы хрparty

дакументаў, што прадстаўляе магчымасць узнавіць персанальны складураднікаў Менскага магістрата за 1663–1680 гг. Акрамя гэтага, кніга спраў вячыстых за 1663–1680 гг. змяшчае звесткі аб былых менскіх ураднікаў у паўторных актыкацыях выпісаў за першую палову XVII ст., у апісаннях месцазнаходжання зямельных уладанняў у дакументах па справах з нерухомай маёмасцю (калі ўказваліся былыя ўладальнікі нерухомасці ці суседзі), тастаментах і некаторых іншых разнавіднасцях запісаў.

Паводле даных дакументаў кнігі спраў вячыстых за 1663–1680 гг. магчыма прасачыць не толькі кар’ерны рост, сацыяльны статус ураднікаў, але і высветліць іх прафесійную прыналежнасць, маёмаснае становішча, роднасныя сувязі і веравызнанне. Усе разнавіднасці актыкацый, унесеных у кнігу, вызначаюць пэўныя службовыя абавязкі членаў магістрата, якія яны выконвалі на кожным этапе пры складанні і зацвярджэнні дакумента. Невялікая колькасць запісаў указвае на персаналіі і абавязкі такіх службовых асоб Менскага магістрата як пісар, гмінныя, цэхмістры, паспольства, слугі мейскія, інстыгатары і інш.

Дакументаў па судовай, адміністрацыйна-распарадчай і фінансавай дзейнасці магістрата ў кнізе няшмат. Аднак прадстаўленыя нават у невялікай колькасці такія запісы з’уляюцца каштоўнымі для вывучэння структуры і дзейнасці гарадскога самакіравання Менска: сустракаюцца звесткі аб узаемаадносінах гарадской юрыдыкі з іншымі адміністрацыйнымі цэнтрамі і прадстаўніцтвам каралеўскай улады ў горадзе (войтам і лантвойтам); называецца колькасць іншых юрыдык Менска; на падставе дакументаў на нерухомасць магчыма вызначыць прыблізныя межы ратушнай юрыдыкі; ёсць звесткі аб штогадовых выплатах і памеры падаткаабкладання, а таксама карыстанні арэнднай гарадской нерухомасцю і размеркаванні з прыбытку іншых грашовых паступленняў; добраўпарадкаванні гарадской маёмасці і інш. [2; 3; 4; 5].

4. Кніга пратаколаў 1674–1680 гг. храналагічна ахоплівае меншы перыяд часу ў параўнанні з кнігай спраў вячыстых 1663–1680 гг. Яна з’яўляецца галоўнай крыніцай для вывучэння гісторыі гарадскога самакіравання Менска ў другой палове XVII ст. Яе запісы змяшчаюць больш інфармацыі па пытаннях дзейнасці і функцыянавання Менскага магістрата ў адзначаны перыяд. У пратаколах пасяджэнняў дакладна агаворваюцца дні і пэўны час пачатку сходаў, называюцца дні па-за планавых склікanняў, прычыны і час пераносу пасяджэнняў і інш. Акрамя гэтага, у кнігу ўпісаны пратаколы енеральных і вальных сесій, на якіх на пачатку года вырашаліся самыя важныя пытанні (перадача паўнамоцтваў новай змене ўраднікаў, арэнда гарадской нерухомай маёмасці, складанне

клятвы і ганаровае ўступленне на пасаду новых членаў магістрата і інш.), а таксама праводзіліся выбары і выслухоўвалася прысяга службовых асоб. Каштоўную інфармацыю змяшчаюць пратаколы аўторкавых сесій магістрата па бягучых справах (збор і выплата падаткаў у гарадскі і дзяржаўны скарб, рэгуляванне пытанняў па справах гандлю, продаж гарадской маёмасці, злоўжыванне ўраднікамі службовымі абавязкамі, заслухоўванне прысягі ўраднікаў і менскіх мяшчан і інш.).

Кніга пратаколаў за 1674–1680 гг. змяшчае больш звестак аб канфесійнай прыналежнасці ўраднікаў і іншых службовых асоб, замене рочных, выбары на пасады і выкананне прысягі абранымі асобамі, службовых абавязках і паўнамоцтвах розных катэгорый ураднікаў і іншага персаналу магістрата (мужах гмінных, цэхмістрах, паспольстве, слугах мейскіх, бірчых, шафарах і інстыгатарах). Даныя аб персанальным складзе ўраднікаў магістрата ў запісах кнігі пратаколаў за 1674–1680 гг. істотна дапаўняюць інфармацыю, якая прысутнічае ў кнізе спраў вячыстых за 1663–1680 гг. [2; 3; 4; 5; 8; 10; 13; 15; 16].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Матэрыялы дысертацыйнага даследавання былі выкарыстаны для падрыхтоўкі новых экскурсійных маршрутаў па экспазіцыі мінскай гарадской ратушы, а таксама для падрыхтоўкі тэматычных экскурсій па гістарычнаму цэнтру Мінска (акт укаранення ад 17.09.2021 г.). Вопісы загалоўкаў дакументаў кнігі спраў вячыстых за 1663–1680 гг. выкарыстоўваюцца ў працы НГАБ (акт укаранення ад 20.01.2022 г.).

1) Вынікі дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы абагульняючых прац па крыніцазнаўству, гісторыі Беларусі, сацыяльна-палітычнай гісторыі беларускіх гарадоў і органаў гарадскога самакіравання.

2) Матэрыялы дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы спецкурсаў па крыніцазнаўству, сацыяльна-палітычнай гісторыі гарадоў, гісторыі гарадскога самакіравання, гісторыі горада Мінска.

3) Матэрыялы дысертацыйнага даследавання таксама могуць быць выкарыстаны як краязнаўчы матэрыял, пры падрыхтоўкі кантрольнага тэксту экскурсій, музейных выстаў і экспазіцый, а таксама для стварэння біяграфічных і бібліяграфічных даведнікаў.

# СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА ВУЧОНАЙ СТУПЕНІ

## Артыкулы ў навуковых выданнях, уключаных у Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў

1. Палтаржыцкая, Н. М. Тэстаменты актавых кніг запісаў менскага магістрата другой паловы XVII ст. (крыніцазнаўчы аспект) / Н. М. Палтаржыцкая // Молодежь в науке – 2012 : прил. к журн. «Вес. Нац. акад. навук Беларусі» : в 5 ч. / Нац. акад. наук Беларуси, Совет молодых ученых НАН Беларуси. – Минск, 2012. – Ч. 2 : Серия гуманитарных наук / редкол.: А. А. Коваленя (гл. ред.) [и др.]. – С. 29–33.

2. Палтаржыцкая, Н. М. Зямельныя ўладанні князёў Радзівілаў у Мінску (паводле дакументаў XVI – XVIII стст.) / Н. М. Палтаржыцкая // Вес. Акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2012. – № 2. – С. 69–75.

3. Палтаржыцкая, Н. М. Склад органаў гарадскога самакіравання Менска ў 1663–1680 гг. (паводле дакументаў актавых кніг) / Н. М. Палтаржыцкая // Архіварыус : зб. навук. паведамл. і арт. / Дэпартамент па арх. і справаводству М-ва юстыцыі Рэсп. Беларусь, Нац. гіст. арх. Беларусі. – Мінск, 2017. – Вып. 15. – С. 167–177.

4. Палтаржыцкая, Н. Крыніцы па вывучэнні дапаможнага персаналу Менскага магістрата другой паловы XVII ст. / Н. Палтаржыцкая // Беларус. гіст. часоп. – 2018. – № 4. – С. 22–31.

5. Палтаржыцкая, Н. Арганізацыя гарадскога самакіравання Менска ў 1663–1680 гг. / Н. Палтаржыцкая // Беларус. гіст. часоп. – 2019. – № 12. – С. 31–37.

## Публікацыі ў зборніках матэрыялаў канферэнцый

6. Статкевіч, Н. М. (Палтаржыцкая, Н. М. ) Кніга актавых пратаколаў 1674–1680 гг. мінскага магістрата як крыніца па гісторыі горада др. паловы XVII ст. / Н. М. Статкевіч (Палтаржыцкая, Н. М. ) // Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі: да 510-годдзя надання Мінску магдэбургскага права : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 4–5 верас. 2009 г. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі ; рэдкал.: А. А. Каваленя (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2010. – С. 38–41.

7. Статкевіч, Н. (Палтаржыцкая, Н.) Менск і род Радзівілаў: зямельныя ўладанні магнатаў у горадзе ў XVI–XVII стст. / Н. Статкевіч (Палтаржыцкая, Н.) // Нясвіжскі палац Радзівілаў: гісторыя, новыя

даследаванні. Вопыт стварэння палацавых музейных экспазіцый : матэрыялы I Міжнар. навук.-практ. канф., Нясвіж, 20 кастр. 2009 г. / Нац. гіст.-культур. музей-запаведнік «Нясвіж» ; рэдкал.: В. А. Сталярчук (гал. рэд.) [і інш.]. – Нясвіж, 2010. – С. 163–169.

8. Статкевіч, Н. М. (Палтаржыцкая, Н. М.) Вывучэнне складу і дзейнасці менскіхураднікаў другой паловы XVII ст. на падставе дакументаў магістрацкіх кніг (крыніцазнаўчы аспект) / Н. М. Статкевіч (Палтаржыцкая, Н. М.) // Научные стремления – 2010 : сб. материалов Респ. науч.-практ. молодеж. конф. с междунар. участием, Минск, 1–3 нояб. 2010 г. : в 2 ч. / Нац. акад. наук Беларуси, Совет молодых ученых НАН ; редкол.: В. В. Казбанов [и др.]. – Минск, 2010. – Ч. 1. – С. 282–286.

9. Палтаржыцкая, Н. М. Да пытання аб лёсе актавых кніг менскага магістрата XVII ст. / Н. М. Палтаржыцкая // Архіварыус : зб. навук. паведамл. і арт. / Дэпартамент па арх. і справаводству М-ва юстыцыі Рэсп. Беларусь, Нац. гіст. арх. Беларусі. – Мінск, 2011. – Вып. 9. – С. 136–141.

10. Палтаржыцкая, Н. М. Адзін дзень урадніка менскага магістрата ў другой палове XVII ст. / Н. М. Палтаржыцкая // Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі. Крыніцы па гісторыі горада. Сацыяльныя структуры і паўсядзеннасць: да 945-годдзя Мінска : зб. навук. арт. / Нац. акад. Беларусі, Ін-т гісторыі ; уклад. А. І. Груша ; рэдкал.: А. А. Каваленя (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2012. – С. 169–177.

11. Статкевіч, Н. М. (Палтаржыцкая, Н. М.) Актавыя кнігі «спраў вячыстых» менскага магістрата другой паловы XVII ст. як крыніцы па гісторыі інстытута самакіравання горада / Н. М. Статкевіч (Палтаржыцкая, Н. М.) // Романовские чтения – 7 : сб. ст. Междунар. науч. конф., Могилев, 26 нояб. 2010 г. / Могилев. гос. ун-т ; редкол.: А. А. Воробьев (гл. ред.) [и др.]. – Могилев, 2011. – С. 78–79.

12. Палтаржыцкая, Н.М. Крыніцазнаўчая каштоўнасць і інфарматыўнасць кніг гарадскога самакіравання (на прыкладзе магістрацкіх кніг Менска за другую палову XVII стагоддзя) / Н.М. Палтаржыцкая // Пічэтаўскія чытанні – 2021: 100 гадоў БДУ – першаму ўніверсітэту Беларусі : матэрыялы міжнар. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 27–28 кастр. 2021 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: А. Д. Кароль (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2021. – С. 615–620.

## Тэзісы ў зборніках матэрыялаў канферэнцый

13. Палтаржыцкая, Н. Арганізацыя гарадскога самакіравання Менска ў другой палове XVII ст. (па матэрыялах магістрацкіх кніг) /

Н. Палтаржыцкая // II канферэнцыя маладых даследчыкаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі «ARS LONGA: навуковыя дасягненні і перспектывы»: 90-годдзю Інстытута гісторыі НАН Беларусі прысвячаецца, Мінск, 4–5 крас. 2019 г. : зб. тэз. / Ін-т гісторыі Нац. акад. навук Беларусі, Савет маладых вучоных ; пад. рэд.: А. Трубчык [і інш.]. – Мінск, 2019. – С. 42.

14. Палтаржыцкая, Н. Звесткі аб стане захавання архіва і колькасным складзе кніг Менскага магістрата ў XIX ст. / Н. Палтаржыцкая // III канферэнцыя маладых даследчыкаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі «ARS LONGA: навуковыя дасягненні і перспектывы», Мінск, 21 мая 2020 г. : праграма и зб. тэз. / Ін-т гісторыі Нац. акад. навук Беларусі, Савет маладых вучоных ; пад рэд.: Т. Даўгач [і інш.]. – Мінск, 2020. – С. 92–93.

15. Палтаржыцкая, Н. Злоўжыванні службовым становішчам і непатызм у гарадскім самакіраванні Менска ў другой палове XVII ст. (па запісах магістрацкіх кніг) / Н. Палтаржыцкая // IV Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя маладых даследчыкаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі «ARS LONGA: навуковыя дасягненні і перспектывы», Мінск, 14–16 крас. 2021 г. : праграма и зб. тэз. / Ін-т гісторыі Нац. акад. навук Беларусі, Савет маладых вучоных ; пад навук. рэд.: Т. Даўгач [і інш.]. – Мінск, 2021. – С. 135–138.

16. Палтаржыцкая, Н.М. Адлюстраванне асобы і ролі войта ў гарадскім самакіраванні Менска ў другой палове XVII ст. у магістрацкіх кнігах / Н.М. Палтаржыцкая // V Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя маладых даследчыкаў Інстытутата гісторыі НАН Беларусі «ARS LONGA: навуковыя дасягненні і перспектывы», Мінск, 20–21 крас. 2022 г.: праграма и зб. тэз. / Ін-т гісторыі Нац. акад. навук Беларусі, Савет маладых вучоных ; пад навук. рэд.: Т. Доўгач [і інш.]. – Мінск, 2022. – С. 100–103.

## РЭЗЮМЭ

**Палтаржыцкая Надзея Мікалаеўна**

**Актавыя кнігі Менскага магістрата другой паловы XVII ст. як крыніцы па гісторыі самакіравання горада**

**Ключавыя словы:** магістрат, Менск, Мінск, магістрацкія кнігі, гарадское самакіраванне.

**Мэта даследавання:** вызначыць крыніцазнаўчую каштоўнасць менскіх магістрацкіх кніг другой паловы XVII ст. у вывучэнні гарадскога самакіравання Менска.

**Метады даследавання:** прынцыпы аб’ектыўнасці, гістарычнай каштоўнасці, сістэмнасці і гістарызму. Выкарыстоўваліся спецыяльныя метады дапаможных гістарычных дысцыплін крыніцазнаўчага цыклу: дыпламатыкі, палеаграфіі і кадыкалогіі.

**Навуковая навізна даследавання:** у дадзенай дысертацыі ўпершыню ў айчыннай гістарыяграфіі зроблены аналіз менскіх магістрацкіх кніг як крыніц па гісторыі самакіравання горада: даследаваны самыя раннія з захаваўшыхся кніг за другую палову XVII ст. і праведзена іх кадыкалагічнае апісанне; вызначана крыніцазнаўчая каштоўнасць дакументаў і запісаў магістрацкіх кніг пры даследаванні гарадскога самакіравання; праведзена характарыстыка спецыфікі магістрацкіх кніг паводле ўнесеных у іх дакументаў і запісаў; на аснове комплекснага аналізу іх дакументаў і запісаў устаноўлена, што кнігі Менскага магістрата з’яўляюцца галоўнай крыніцай для вывучэння гарадскога самакіравання.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні:** вынікі дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы абагульняючых прац па крыніцазнаўству, гісторыі Беларусі, гісторыі Мінска, гісторыі беларускіх гарадоў, як краязнаўчы матэрыял, для падрыхтоўкі музейных выстаў і экспазіцый, тэкстаў экскурсій

**Галіна выкарыстання:** крыніцазнаўства, гісторыя Беларусі, музейная справа, краязнаўства, турыстычная дзейнасць.

## РЕЗЮМЕ

**Полторжицкая Надежда Николаевна**

**Актовые книги Менского магистрата второй половины XVII в. как источники по истории самоуправления города**

**Ключевые слова:** магистрат, Менск, Минск, магистратские книги, городское самоуправление.

**Цель исследования:** определить источниковедческую ценность менских магистратских книг второй половины XVII в. при изучении городского самоуправления Менска.

**Методы исследования:** принципы объективности, исторической ценности, системности и историзма. Использовались специальные методы вспомогательных исторических дисциплин источниковедческого цикла: дипломатики, палеографии и кодикологии.

**Научная новизна исследования:** в данной диссертации впервые в отечественной историографии проанализированы менские магистратские книги как источники по истории самоуправления города: исследованы самые ранние из сохранившихся книг за вторую половину XVII в. и проведено их кодикологическое описание; определена источниковедческая ценность документов и записей магистратских книг при исследовании городского самоуправления; проведена характеристика специфики магистратских книг по внесенным в них разновидностям документов и записей; на основании комплексного анализа их документов и записей установлено, что книги Менского магистрата являются главным источником при изучении городского самоуправления.

**Рекомендации к использованию:** результаты диссертационного исследования могут быть использованы при подготовке обобщающих работ по источниковедению, истории Беларуси, истории Минска, истории белорусских городов, как краеведческий материал, для подготовки музейных выставок и экспозиций, текстов экскурсий.

**Область использования:** источниковедение, история Беларуси, музейное дело, краеведение, туристическая деятельность.

## SUMMARY

**Paltarzhytskaja Nadzieja**

**Books of the Minsk magistrate of the second half in the XVII century as sources on the history of the city's self-government**

**Key words:** magistrate, Miensk, Minsk, magistrate's books, city self-government.

**Objective:** to determine the source value of the Minsk magistrate books of the second half of the 17th century in the study of the city self-government of Minsk

**Research methods:** principles of objectivity, historical value, consistency and historicism. Special methods of auxiliary historical disciplines of the source study cycle: diplomacy, paleography, codicology.

**Scientific newness of research:** in this dissertation, magistrate's books as sources on the history of city self-government are analyzed for the first time: the complex of books of the Minsk magistrate for the second half of the XVII century is studied and a codicological description of the preserved books is carried out; the source value of magistrate's books is determined when studying city self-government in comparison with other types of sources; the specifics of magistrate's books are characterized by the varieties of documents and records included in them; based on a comprehensive analysis of their documents and records, it was established that the books of the Minsk magistrate is the main source for studying city self-government.

**Recommendation for use:** the results of the dissertation research can be used in the preparation of generalizing works on source studies, the history of Belarus, the history of Minsk, the history of Belarusian cities. The information can also be used as a local history material and for preparing museum exhibitions and expositions, texts of excursions.

**Sphere of use:** source studies, history of Belarus, museums, local history, tourist activities.